**Кантрольныя тэсты па тэме “Словазлучэнне”**

**Тэст 1**

**1.** ***Адзначце правільнае сцверджанне:***

1) *Словазлучэнне* – сэнсавае і граматычнае аб’яднанне двух ці больш самастойных слоў, звязаных падпарадкавальнай сувяззю.
2) *Словазлучэнне* – камунікатыўная адзінка, што служыць для паведамлення пра факт рэчаіснасці.
3) *Словазлучэнне* – два або некалькі членаў сказа, якія выконваюць аднолькавую сінтаксічную функцыю, адносяцца да аднаго агульнага для іх члена сказа і характарызуюцца інтанацыяй пералічэння.
4) *Словазлучэнне* – спалучэнне слоў, што называюць асобу ці прадмет, да якіх звяртаюцца з мовай.
5) *Словазлучэнне* – спалучэнне слоў, якое служыць для выражэння дадатковага паведамлення, заўвагі, удакладнення, тлумачэння ўсяго асноўнага выказвання.

**2.** ***Адзначце асноўныя прыметы свабоднага словазлучэння:***

1) лексічная самастойнасць кампанентаў;
2) сінтаксічная самастойнасць;
3) узнаўляльнасць;
4) устойлівасць;
5) інтанацыйная завершанасць.

**3.** ***Паводле марфалагічнага выражэння галоўнага кампанента словазлучэнні падзяляюцца на:***

1) фразеалагічныя;
2) дзеяслоўныя;
3) дзеепрыметныя;
4) іменныя;
5) прыслоўныя.

**4.** ***Адзначце іменныя словазлучэнні:***

1) вельмі добра;
2) прачытаны мной;
3) надзвычай прыемны;
4) дарога злева;
5) першы ў свеце.

**5.** ***Адзначце дзеяслоўныя словазлучэнні:***

1) верыць у дабрыню;
2) адчуваючы адказнасць;
3) жаданне паступіць;
4) стомлены працай;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5) надзвычай дрыжачы.

**6.** ***Адзначце простыя словазлучэнні:***
1) новы школьны будынак;
2) больш старанна працаваць;
3) імклівае вызваленне ад захопнікаў;
4) прыгожы чалавек у скуранцы;
5) рукой падаць да вёскі.

**7.** ***Паводле сэнсавых адносін словазлучэнні падзяляюцца на:***
1) азначальныя;
2) субстантыўныя;
3) ад’ектыўныя;
4) суб’ектыўныя;
5) аб’ектныя.

**8.** ***Адзначце словазлучэнні, якія выражаюць азначальныя адносіны:***
1) дзве дзяўчынкі;
2) стол з дубу;
3) клопат пра бацькоў;
4) стральба лежачы;
5) позірк спадылба.

**9.** ***Адзначце спалучэнні слоў, якія не з’яўляюцца словазлучэннямі:***
1) прайсці побач;
2) больш адказна;
3) трыста сорак чатыры;
4) побач чыгункі;
5) няхай спявае.

**10.** ***Адзначце сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні:***
1) шмат народу;
2) імкнуўся дасягнуць;
3) (чалавек) гадоў пад пяцьдзесят;
4) быў нішто;
5) хутка бегчы.

**11.** ***Адзначце словазлучэнні, у якіх кампаненты звязаны дапасаваннем:***
1) абшары палёў;
2) салдат Кавалёў;
3) дубы-вартаўнікі;
4) каманда спыніцца;
5) восеньскае неба.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**12.** ***Адзначце словазлучэнні, у якіх кампаненты звязаны беспрыназоўнікавым кіраваннем:***

1) сустрэча з пісьменнікам;
2) ліст дуба;
3) расці пры дарозе;
4) каля лесу;
5) святло душы.

**13.** ***Адзначце словазлучэнні, у якіх кампаненты звязаны моцным кіраваннем:***

1) збіраць грыбы;
2) адштурхнуцца ад берага;
3) крык птушкі;
4) жадаць шчасця;
5) ехаць вуліцай.

**14.** ***Адзначце словазлучэнні, у якіх кампаненты звязаны прымыканнем:***

1) маё пенснэ;
2) імкненне не адстаць;
3) даўжыня максі;
4) іх песні;
5) елі стоячы.

**15.** ***Адзначце словазлучэнні з граматычнымі памылкамі:***

1) у іншы раз;
2) аддзячыць вас;
3) здзек над людзьмі;
4) дом на пяць пакояў;
5) жыць з бацькамі.

**Тэст 2**

**1.** ***Адзначце асноўныя прыметы сінтаксічна непадзельнага словазлучэння:***

1) лексічная аслабленасць аднаго з кампанентаў;
2) сэнсавае адзінства;
3) сінтаксічная непадзельнасць;
4) устойлівасць;
5) узнаўляльнасць.

**2.** ***Адзначце сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні:***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1) трое паляўнічых;
2) мяккі позірк;
3) стаў пісаць;
4) стала цяжка;
5) кожны з іх.

**3.** ***Адзначце іменныя словазлучэнні:***
1) знясілены працай;
2) гатовы да бою;
3) што-небудзь добрае;
4) прапанова вярнуцца;
5) праца з душою.

**4.** ***Адзначце дзеяслоўныя словазлучэнні:***
1) зжаты своечасова;
2) спыніцца адпачыць;
3) намер падрыхтавацца;
4) загад пачынаць;
5) зрабіўшы справу.

**5.** ***Адзначце прыслоўныя словазлучэнні:***
1) першы ў працы;
2) смялей за іншых;
3) позна восенню;
4) побач дарогі;
5) ліў не перастаючы.

**6.** ***Адзначце складаныя словазлучэнні:***
1) нясцерпная туга па Радзіме;
2) стары дуб з гняздом;
3) ціхая светлая радасць;
4) хуткі прыезд да бацькоў;
5) вельмі адказны.

**7.** ***Адзначце словазлучэнні, якія выражаюць азначальныя адносіны:***
1) першы ўрок;
2) бераг ракі;
3) капялюш з воўны;
4) дружба навекі;
5) мара пра будучае.

**8.** ***Адзначце словазлучэнні, якія выражаюць аб’ектныя адносіны:***
1) намалявана мастаком;
2) будуецца рабочымі;
3) пісаць пяром;
4) даць ключа;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5) араць зямлю.

**9.** ***Акалічнасныя словазлучэнні падзяляюцца на:***
1) меры і ступені;
2) прычынныя;
3) часавыя;
4) прасторавыя;
5) ад’ектыўныя.

**10.** ***Адзначце спалучэнні слоў, якія не з’яўляюцца словазлучэннямі:***
1) песня і музыка;
2) буду прымаць;
3) абапал дарогі;
4) двое ляснічых;
5) быў сустрэўся.

**11.** ***Адзначце словазлучэнні, у якіх кампаненты звязаны дапасаваннем:***
1) сінь неба;
2) летняя раніца;
3) хлопчык-гарэза;
4) загад наступаць;
5) горад Мінск.

**12.** ***Адзначце словазлучэнні, у якіх кампаненты звязаны прыназоўнікавым кіраваннем:***
1) адданасць Радзіме;
2) халодны ад расы;
3) згодна з планам;
4) зрабіць з дрэва;
5) тым часам як.

**13.** ***Адзначце словазлучэнні, у якіз кампаненты звязаны слабым кіраваннем:***
1) гуляць ля ракі;
2) стаць на калені;
3) спаткаць знаёмых;
4) з’ехаць з гары;
5) легчы на спіну.

**14.** ***Адзначце словазлучэнні, у якіх кампаненты звязаны прымыканнем:***
1) спадніца клёш;
2) вельмі адказны;
3) глыбокае метро;
4) просьба не перашкаджаць;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5) яе нораў.

**15.** ***Адзначце словазлучэнні з граматычнымі памылкамі:***
1) хворы грыпам;
2) цешыўся з дачкі;
3) сумаваў па родным;
4) у двух кроках ад дома;
5) пісаць па адрасу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ